**Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК "Лунінецкая РЦБС" у сакавіку**

Прайшлі мерапрыемствы да **Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і незаконным абаротам наркотыкаў**.

**6 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Прайшоў шок-урок "Как жить сегодня, чтобы иметь шанс увидеть завтра" з удзелам інструктара-валеолага Мікашэвіцкай гарадской паліклінікі Людмілы Сцяпанаўны Дзедовіч. Удзельнікам мерапрыемства, вучням 10 "А" класа СШ №2, расказалі аб шкодзе курыльных сумесей, наркатычных рэчываў. Школьнікам уручылі буклеты "Отдай предпочтение жизни без наркотиков".

Прайшлі мерапрыемствы і ў сельскіх бібліятэках. Так, **1 сакавіка** у **Бастынскай с.б**. для падлеткаў правялі гадзіну карыснай інфармацыі "Гэта не павінна здарыцца з табою», у **Ракітненскай с.б.** прайшла інфармацыйная гадзіна "Осторожно! Наркотики» з удзелам фельчара Ракітненскага ФАПа М.Н. Рудовіч, **2 сакавіка** у **Міжлескай с.б.** адбылася гутарка-дыялог для вучняў 5-7 класаў "Образ жизни – только здоровый", у **Бродніцкай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшла ідэйна-выхаваўчая гадзіна "Умей сказать: «НЕТ!" і інш.

Прайшлі мерапрыемствы да народнага свята **"Масленіца".**

**2 сакавіка.** У **Кажан-Гарадокскай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшлі бібліяпасядзелкі "Масленицу провожаем, блинами угощаем!" з удзелам членаў народнага фальклорнага калектыву "Надзея". Прысутных пазнаёмілі з гісторыяй і традыцыямі свята, расказалі пра масленічны каляндар. Кожны жадаючы змог пачаставацца блінамі. У **Люшчанскай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшлі "бліныя" пасядзелкі "Как на масленой неделе..." Бібліятэкар **Вулькаўскай-2** сельскай бібліятэкі правяла конкурсную праграму "Ждём весну".

У бібліятэках РЦБС прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Дню жанчын.**

**5 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Адбыўся цыкл мерапрыемстваў. Для ўдзельнікаў клуба "САМІ" прайшла конкурсная праграма "Ох, уж эти девочки". Бібліятэкар расказала пра гісторыю і традыцыі свята. Далей усе малявалі сваіх мам, актыўна ўдзельнічалі ў конкурсах. У завяршэнні мерапрыемства зрабілі агульную паштоўку з пажаданнямі для ўсіх жанчын.

**6 сакавіка** для вучняў 6 "Б" класа СШ №2 г.Мікашэвічы прайшла пазнавальная праграма "О милых дамах". У першай частцы праграмы бібліятэкар з дапамогай прэзентацыі пазнаёміла ўдзельнікаў з фактамі з жыцця знакамітых суайчынніц і іх дасягненнямі. У другой частцы мерапрыемства разгадвалі крыжаванкі і ўдзельнічалі ў віктарыне "Великие женщины всех времён".

**7 сакавіка. ЦБ.** Для выхаванцаў адзялення дзённага знаходжання івалідаў ТЦСАН правялі пазнавальна-забаўляльную праграму "Есть в марте день особый". Прысутным расказалі пра вядомых жанчын Беларусі. На працягу

мерапрыемства гучалі вершы, высказванні вялікіх людзей аб жанчыне, віншаванні са святам. Усе жадаючыя прынялі ўдзел у майстар-класе па вырабу святочнага вянка.
Таксама ў гэты дзень супрацоўнікі бібліятэкі правялі святочную акцыю з нагоды 8 сакавіка. Усе жанчыны, якія наведалі напярэдадні свята бібліятэку, пачулі ў свой адрас шмат цёплых слоў і віншаванняў, і галоўным сюрпрызам сталі вясновыя кветкі – цюльпаны.
**7 сакавіка. ЦДБ.** Супрацоўнікі бібліятэкі правялі літаратурны ланцужок “Мама, солнце и весна”. Вучні 5 “Б” класа СШ №1 чыталі вершы прысвечаныя матулям і бабулям, пазнаёміліся з кніжнай выставай і аглядам літаратуры “З любоўю да матулі”.
Шэраг мерапрыемстваў прымеркавалі да **Тыдня праваслаўнай кнігі.**
**12 сакавіка. ЦДБ.** Для маленькіх чытачоў правялі гутарку і агляд літаратуры “Книжный мир православия”. Дзяцей пазнаёмілі з рознымі відамі праваслаўнай літаратуры: кнігамі Свяшчэннага Пісання, малітваловамі і мастацкай літаратурай.
**14 сакавіка. ЦДБ.** Для вучняў 5 “Б” класа СШ №1 правялі гадзіну праваслаўя “К духовности через книгу” з удзелам клірыка Крэстаўздіжанскага храма г.Лунінца іерэя Георгія Філіновіча.
**14 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Прайшла гадзіна духоўнасці “Живое слово мудрости духовной” з удзелам іерэя Храма Раства Іаана Прадцечы г.Мікашэвічы Аляксандра Масейчука. Айцец Аляксандр расказаў пра Біблію, растлумачыў як падрыхтавацца да споведзі, як правільна пасціца.
**10-17 сакавіка. ЦБ**. Супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі прынялі ўдзел у II духоўна-краязнаўчай праграме “Лунинская грамматика”, а таксама ў тэматычных сустрэчах “Православная книга – путь к преображению души”, якія прайшлі ў Бастынскай і Вулькаўскай-1 сярэдніх школах, Лунінецкім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы сельскагаспадарчай вытворчасці. Супрацоўнікі прадставілі кніжную выставу “Красота Божьего мира”, паказалі і расказалі пра рэдкія выданні, якія ёсць у фондзе цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.**
**14 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б**. Прайшла прававая гульня для вучняў 6 “А” класа СШ №1 “Закон для всех и каждого”. Дзеці даведаліся пра гісторыю стварэння Канстытуцыі, структуру галоўнага закона дзяржавы.
**15 сакавіка. ЦДБ.** Для вучняў 2 “Г” класа СШ №4 правялі гадзіну прававых ведаў “Я – гражданин Республики Беларусь”. Дзецям расказалі аб Канстытуцыі , яе раздзелах. Усе актыўна адказвалі на пытанні віктарыны.
**15 сакавіка. ЦБ.** Для вучняў СШ №1 правялі прававы ўрок “Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь”, у ходзе якога дзеці пазнаёміліся з цікавымі фактамі з гісторыі Канстытуцыі РБ, удзельнічалі ў віктарыне “Мая Радзіма – Беларусь”.
**15 сакавіка. ЦБ.** У актавай зале бібліятэкі адбылася святочнае паседжанне народнай літаратурна-паэтычнай студыі “Литературная провинция”, прысвечанае юбілею паэтэсы Галіны Гаргун. На мерапрыемстве прысутнічалі прыхільнікі творчасці таленавітай землячкі. Галіна Аляксандраўна прысвяціла

Лунінеччыне шэраг цудоўных вершаў. На сустрэчы яна расказала пра свой няпросты лёс і пазнаёміла ўсіх з лепшымі сваімі творамі. *(Лунінецкія навіны. 2025. 19 сакавіка. С.6)*

Прайшлі мерапрыемствы да дня **Хатынскай трагедыі.**

**20 сакавіка. ЦБ.** Для вучняў СШ №3 правялі гістарычны маналог "Хатынь – говорящая тишина". На мерапрыемстве прысутнічаў краявед Васіль Мікалаевіч Туміловіч, які падрабязна расказаў вучням аб трагічным лёсе Хатыні. Таксама прысутныя здзейснілі віртуальную экскурсію ў Дзяржаўны мемарыяльны комплекс "Хатынь".

У бібліятэках прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Сусветнаму дню паэзіі.**

**21 сакавіка. ЦБ.** Адбылася гадзіна паэтычнага настрою «Мир поэзии прекрасен» для навучэнцаў Лунінецкага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа сельскагаспадарчай вытворчасці. Бібліятэкар расказала пра шматгранны свет паэзі, якая аб'ядноўвае краіны, народы, культуры, пазнаёміла з гісторыяй узнікнення дня паэзіі. Са сваёй творчасццю удзельнікаў мерапрыемства пазнаёмілі паэты Лунінеччыны, члены народнай літаратурна-паэтычнай студыі "Литературная провинция" Віктор Пінігін і Людміла Ефімава. Госці падрыхтавалі да чытання вершы ўласнага сачынення і любімыя радкі майстроў паэтычнага слова.

**21 сакавіка. Мікашэвіцкая г.б.** Адбылася літаратурная гасцёўя "Сражаюсь, верую, люблю" па творчасці Эдуарда Асадава. Бібліятэкар расказала аб мужнасці паэта ў гады Вялікай Айчынай вайны, атрыманым цяжкім раненні, пасля якога ён страціў зрок. Удзельнікі мерапрыемства чыталі праніклівыя вершы Эдуарда Асадава, такія простыя і такія напоўненыя глыбокім сэнсам, і вершы іншых любімых паэтаў.

Прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Году добраўпарадкавання**.

**20 сакавіка. ЦДБ**. Для юных карыстальнікаў правялі экалагічную экскурсію "Маленьким белорусам о большой Беларуси". Дзеці даведаліся шмат цікавага пра нашу краіну: пра Белавежскую пушчу, падарожнічалі па роднай Лунінеччыне, пазнаёміліся з серыяй кніг "Дзіцячая Чырвоная кніга". Дзеці ўспаміналі прыказкі і прымаўкі аб лесе, адгадвалі загадкі аб лясных насельніках, успаміналі правілы паводзін у прыродзе.

Да **Міжнароднага дня лясоў** у **Бастынскай сельскай бібліятэцы** прайшла экалагічная гадзіна "Лес – нацыянальнае багацце".

**22 сакавіка** супрацоўнікі **Вялікачучавіцкай с.б.** прынялі ўдзел у рэспубліканскай акцыі "Дай лесу новае жыццё", якая стартавала ў Беларусі.

**22 сакавіка. ЦДБ.** У рамках народнага ВідэаКалендара "Сонцазварот" у бібліятэцы адбылася фальклорнае свята "Гуканне вясны". Мерапрыемства прайшло з удзелам вучняў 5 "Г" класа СШ №4 г.Лунінца.